■ Наўздагон

# МСЦІСЛАЎ ПАВІНЕН СТАЦЬ ГОРАДАМ-МУЗЕЕМ

## Пра гэта ішла гаворка падчас рыцарскага фэсту

**Нешматлюдны Мсціслаў у мінулую суботу нагадваў сапраўдны курортны горад, дзе днём і ноччу кіпіць жыццё. Прыемна ўразіла і тое, што беларуская мова гучала на святочных вуліцах даволі часта, а людзі ахвотна набывалі сувеніры з нацыянальнай сімволікай. Крыху засмуціла, што гандляры занадта завысілі кошт на беларускія выданні. Прынамсі, на тыя з іх, якія прыходзілася бачыць у кнігарнях. І, мякка кажучы, трохі пакрыўдзіла, што выбар беларускамоўнай літаратуры ў гандлёвых шэрагах быў цікавейшы і шырэйшы, чым у магазінах.**

### КАПЛІЦА Ў ГОНАР ЗАСНАВАЛЬНІКА

На Замкавай гары яшчэ ў пятніцу вырас цэлы рыцарскі лагер розных ордэнаў і ваенна-гістарычных клубаў з Беларусі і Расіі. Таксама на свята прыбылі шматлікія афіцыйныя дэлегацыі з суседніх раёнаў Магілёўскай і Смаленскай абласцей, прадстаўнікі абласной улады, вучоныя, духавенства.

— За гады існавання фэсту яго ўдзельнікамі сталі дзясяткі музычных груп, ваенна-гістарычных клубаў, горад наведалі тысячы турыстаў, — адзначыў падчас адкрыцця **старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Васіль ВІЦЮНОЎ**. — Свята прадугледжвае не толькі вяртанне духа даўніны, гэта найперш за ўсё праслаўленне нашых выдатных продкаў, у крыві якіх жыла любоў да сваёй зямлі і народа.

Адной са значных падзей стала асвячэнне капліцы ў гонар заснавальніка горада Расціслава Мсціслававіча, якая пабудавана непадалёк ад Замкавай гары. Можна казаць, Мсціслаў адзін з нешматлікіх гарадоў, якія знаходзяцца пад аховай святога — мсціслаўскі князь далучаны да ўліку ўгоднікаў Божых і шануецца Беларускай Праваслаўнай Царквой. У гонар нябеснага заступніка горада адбыўся хрэсны ход ад царквы Тупічэўскай іконы Божай Маці. Дарэчы, менавіта там былі выстаўлены для пакланення мошчы блажэннай Матроны Маскоўскай, прападобнай пакутніцы вялікай княгіні Елісаветы Фёдараўны і інакіні Варвары. Вернікі гадзінамі стаялі ў чарзе, каб прыкласціся да гэтых святыняў.

### ДРУГОЕ БЯРЭСЦЕ НА ЗАМКАВАЙ ГАРЫ

Пра тое, што Мсціслаў — выключны горад і яму трэба прыдаць адпаведны статус, казаў **доктар гістарычных навук, загадчык кафедры спецыяльных гістарычных дысцыплін МДУ імя Куляшова, прафесар Ігар МАРЗАЛЮК**. За апошні час горад стаў месцам цэлага шэрагу гістарычных адкрыццяў і сенсацый. І на гэты раз Максім Ярмохін, спецыяліст па дэндрахраналогіі, зрабіў сенсацыйнае паведамленне: Мсціслаў, датай заснавання якога лічыўся 1135 год, як мінімум на 80 гадоў старэйшы. Ён гэта высветліў, зрабіўшы аналіз фрагментаў драўніны са старажытнага гарадскога вала.



— Гэта ўнікальны горад, такога няма ва ўсім сусвеце, — радаваўся Ігар Марзалюк. — Горад, без якога гісторыя Беларусі не можа быць прачытана цалкам. Тут нарадзіўся Пётр Мсціславец, які разам з Іванам Фёдаравым надрукаваў першую кнігу ў Маскве і ў Львове; кампазітар Казлоўскі, настаўнік Агінскага — аўтара несмяротнага паланэза; скульптар Мікешын, які стварыў помнікі Багдану Хмяльніцкаму ў Кіеве і ў гонар тысячагоддзя Русі ў Ноўгарадзе. Узгадаем і ўсіх тых, хто будаваў гэты велічны горад і цаной жыцця абараняў яго, калі гэта было трэба. «Мсціслаўцы не паміраюць на сваёй лаўцы», «Мсціслаў многіх сціснуў» — гэтыя гордыя прымаўкі, якім 600-700 гадоў, вельмі выразна, трапна адлюстроўваюць веліч гэтага характару. Гэты горад і сёння застаецца музеем. Трэба зрабіць так, каб статус стаў афіцыйным, каб Мсціслаў атрымаў права звацца рэспубліканскім гісторыка-культурным запаведнікам. Кажучы словамі нашага беларускага паэта Алеся Разанава: «Рэчы — гэта апошняе цела людзей, што жыве надаўжэй; рэчамі акрэсліваецца мой час, вызначаецца мая прастора». Праз гэтыя рэчы мы ўзгадваем нашых продкаў».



Фото tut.by.

Летась студэнтамі гістфака МДУ імя Куляшова пад кіраўніцтвам Ігара Марзалюка знойдзена шмат унікальных артэфактаў і тая самая драўляная маставая, якая, як высветлілася, датуецца не XII, а XI стагоддзем. Горад за час яго існавання тройчы амаль цалкам знішчалі пажары. Але ён уваскрасаў, як той казаў, з попелу. Спецыялісты ўмацавалі сцены пляцоўкі, каб яны не разбураліся і накрылі раскоп тэнтам. «У далейшым ён будзе надзейна закансерваваны і пераўтвораны ў музей накшталт Бярэсця», — абяцае вучоны.



На фэсце кожны ахвотны змог зазірнуць углыб стагоддзяў і ўбачыць там контуры старадаўняй маставой і нават кузні.

### НАГАВОРНАЕ ЗЕЛЛЕ І МЕТАД ПЛАЦЭБА

У Мсціславе можна было падзівіцца і на жахлівыя прылады катавання часоў інквізіцыі — калыску Іуды, іспанскае крэсла, маску ганьбы... Пры адным позірку на гэтыя прыстасаванні дрыжыкі беглі па скуры: наколькі ж далёка могуць ісці людзі ў сваёй дзікасці і жорсткасці. Хаця хто ведае, дзе мяжа крайнасці: у галовах тых, дзе нараджаюцца гэтыя смертаносныя рэчы, або тых, хто гатовы сесці на металічныя стрыжні, каб толькі сфатаграфавацца.

А вось выставу-экспазіцыю мясцовых прадпрыемстваў, арганізацый і адукацыйных устаноў нават шукала спецыяльна. Дзе яшчэ можна пабачыць прадметы Сярэднявечча ў параўнанні з сучаснымі? Крэатыўна да справы падышлі медыкі. На іх стале ў колбачках і мензурках чаго толькі не было — нагаворнае зелле, наркоз у выглядзе малатка і нават сродак ад дэпрэсіі ў выглядзе... вяроўкі з пятлёй.



— Мы прадстаўляем медыцыну Мсціслаўскага раёна ў Сярэднявеччы, — паведаміла **намеснік галоўнага ўрача цэнтральнай раённай бальніцы Наталля ФІЛІПЕНКА**. На час свята яна пераапранулася ў знахарку-вядзьмарку, а яе калега нагадвала крумкача ў адзенні доктара, што працуе ва ўмовах чумы. — Раней лячылі ў асноўным зёлкамі і так званым метадам плацэба. Калі чалавек верыць, яму нічога не страшна. Гэты метад добра дзейнічае і сёння. А вось з лекамі ў Сярэднявеччы было цяжка: калі пачытаць старадаўнія рэцэпты, то можна спужацца — прапануюць узяць кілаграм земляных чарвякоў або барсуковыя лапкі, кавалак скальпа з галавы злодзея, дабавіць анісавы алей, змяшаць, зварыць і мазаць хворыя суставы.

### МЕЧ ЗА АДВАГУ

Самым хвалюючым момантам фестывалю, вядома ж, было ўзнагароджанне. Рыцары выкладваліся падчас сутычак так, што ў прамым сэнсе слова валіліся з ног ад стомы. Але нават самыя змораныя знайшлі сілы прыйсці на Цэнтральную плошчу, каб павіншаваць найлепшых.

У намінацыі «Баі Сярэднявечча» першае месца атрымала ваенна-спартыўнае аб'яднанне «Варта» са Смаленска. Баі «Шчыт і меч», напэўна, адны з самых жорсткіх, бо рыцары на рысталішчы б'юцца адзін на адзін. У намінацыі перамог прадстаўнік клуба «Крыжаносец» Аляксей Антонаў, у якасці падарунка ён атрымаў меч. У турніры лучнікаў не было роўных Аляксандру Кражаву — кіраўніку мінскага клуба лучнікаў Bow's club. І ўпершыню на фестывалі адбыўся турнір троек, дзе бой ішоў паміж рыцарамі і іх збраяносцамі. І тут пальму першынства ўзялі «Птахі».

Але ніхто з удзельнікаў не застаўся без увагі. Кожны атрымаў дыплом і падзякі. А раніцай горад апусцеў. Каб праз год зноў ператварыцца ў цэнтр Сярэднявечча.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*
**Фота аўтара**

---

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

## Агуркі да самых замаразкаў



**Здаровыя і дужыя кусты агуркоў павінны доўга радаваць гаспадароў сваім ураджаем. Але нярэдка ўжо ў жніўні агурочныя плеці пачынаюць вянуць, і да сярэдзіны — канца месяца збор ўраджаю завяршаецца. Калі вы заўважылі першыя трывожныя прыкметы, не адчайвайцеся — падоўжыць плоданашэнне агуркоў да верасня і нават да кастрычніка цалкам магчыма!**

**Для гэтага неабходна ведаць некалькі тонкасцяў, улічваючы якія вы зможаце збіраць ураджай да першых замаразкаў.**

**1.** Нельга пакідаць на расліне саспелыя агуркі. Гэта рэзка запавольвае рост маладых пладоў і скарачае жыццё куста. Агуркі трэба збіраць пастаянна, па меры паспявання.

**2.** У жніўні, калі тэмпература паветра ўжо зніжаецца, карані агуркоў пачынаюць горш засвойваць пажыўныя рэчывы з глебы (для даведкі: калі адбылося зніжэнне тэмпературы на 1 градус — паглынальная здольнасць каранёў памяншаецца на 15%). Правільным будзе скараціць каранёвыя падкормкі ўдвая, а то і ўтрая, а вось пазакаранёвыя (па лісці) стануць у гэты перыяд добрай падтрымкай жыццядзейнасці.

Для пазакаранёвай падкормкі са жніўня выдатна падыдуць:

— раствор мачавіны (15 г на 10 л вады);

— прэпараты «Цыркон», «Элін».

**3.** Калі глеба пад раслінамі не замульчыравана, то абавязкова трэба пакрыць зямлю торфам, пілавіннем, перагноем ці іншым матэрыялам, які мульчыруе, слоем у 4—7 см — гэта абароніць далікатныя паверхневыя карэньчыкі ад начнога пахаладання, а ўдзень працягне засцерагаць ад перагрэву.

**4.** Перапады дзённых і начных тэмператур, халодныя ночы з багатымі росамі, якія наступаюць ужо ў жніўні, і зацяжныя дажджы спрыяюць развіццю захворванняў. Калі расліны захварэюць, гэта істотна скароціць тэрмін іх жыцця, таму вельмі важна праводзіць прафілактычныя ахоўныя мерапрыемствы.

**5.** Нягледзячы на набліжэнне восені, трэба абавязкова працягваць стымуляваць рост новых парасткаў з завязямі. Для гэтага, як і раней, варта рэгулярна выдаляць усе пажоўклыя лісты і тыя, якія размяшчаюцца ніжэй зоны плоданашэння — яны расліне не патрэбны і толькі адбіраюць у яе пажыўныя рэчывы, якія цяпер на вагу золата.

**6.** Калі ў вас растуць сарты агуркоў, якія патрабуюць апылення, трэба падумаць пра прыцягненне насякомых-апыляльнікаў. Добра, калі на агародзе або побач з дачай растуць агурочная трава, крывасмок лекавы, касталом лекавы, мацярдушка звычайная, фацэлія, хрызантэмы і іншыя расліны, якія цвітуць у жніўні і верасні, таму што ў барацьбе за познялетні і восеньскі ўраджай лепшай групы падтрымкі, чым пчолы, цяжка прыдумаць.

**7.** Некаторыя агароднікі для падаўжэння плоданашэння з поспехам ужываюць поліэтыленавую плёнку, якой ахоўваюць агуркі ад халодных дажджоў. Засцерагаючы расліны ад неспрыяльных умоў і прымаючы плёнку ў пагодныя сонечныя дні, можна істотна працягнуць жыццё агурочных кустоў.

**8.** Эфектыўны прыём — амаладжэнне куста. Для гэтага ніжнюю частку агурочнай плеці укладваюць на зямлю і прысыпаюць вільготнай глебай. Новыя карэньчыкі, якія з'яўляюцца на прысыпаных сцёблах, пачынаюць актыўна падсілкоўваць расліну і стымулююць плоданашэнне.

А вось плеці, якія растуць гарызантальна (якія ляжаць на зямлі), чапаць не рэкамендуецца, таму што яны натуральным шляхам, дзе гэта было магчыма, ужо сфармавалі дадатковыя карэньчыкі. Перакладанне парасткаў з месца на месца будзе толькі разбураць гэтыя карані. І, як вынік, такая «дапамога» знізіць ураджайнасць.

**9.** Добра зарэкамендаваў сябе метад пасадкі агуркоў у некалькі тэрмінаў. Калі дадатковага месца на дачных градках няма, можна падсаджваць маладую расаду да «старых» кустоў. Расаду вырошчваюць як з насення, так і з пасынкаў. Прычым «пасынкавыя» кусцікі пачнуць пладаносіць значна хутчэй за насенныя. Такога ж эфекту можна дасягнуць шляхам правільнага планавання — пасадкі сартоў з рознымі тэрмінамі плоданашэння. Трэба проста пасядзець вясной з алоўкам у руках, выбраўшы для сябе самыя ўдалыя.

**З назіранняў агароднікаў**

✓ Даўжэй плоданосяць агуркі ў вертыкальных градках. Яны і асвятляюцца раўнамерна, і добра праветрываюцца, таму менш хварэюць і даўжэй жывуць.

✓ Ва ўнутраным дворыку, абароненым ад вятроў, агуркі даюць большы ўраджай і даўжэй пладаносяць.

✓ Для позніх пасеваў трэба аддаць перавагу гібрыдам, якія самаапыляюцца — ураджайнасць іх вышэй.

✓ Пры вырошчванні агуркоў для падсадкі трэба старацца максімальна захаваць усё лісце — фотасінтэз павінен «працаваць ударна».

## Бардоская сумесь і правілы яе прыгатавання




Хто не ўжываў на сваім дачным участку бардоскую вадкасць? Напэўна, усе. Таму што дачныя расліны, як і людзей, трэба не толькі карміць, паіць і песціць, але яшчэ абараняць і лячыць. Бо як і ў нас, у раслінным царстве поўна ворагаў, нахлебнікаў і шкоднікаў! Бардоская сумесь — вельмі вядомы раствор меднага купарвасу ў вапнавым малачку. Яе выкарыстоўваюць як фунгіцыд (хімікат для барацьбы з грыбковымі захворваннямі агароднінных і садовых культур). Медны купарвас са старажытных часоў выкарыстоўваўся медыкамі як састаўная частка парашкоў і прыпарак, ды і сёння можна знайсці медыцынскія рэцэпты з яго выкарыстаннем. А вось цудоўныя ахоўныя ўласцівасці гэтага рэчыва для раслін, як лічыць гісторыя, былі «адкрыты» цалкам выпадкова.

У сумна вядомыя 5 гадоў вялікага бульбянога голаду ў Ірландыі, калі фітафтора знішчыла УВЕСЬ ураджай бульбы ў краіне, рэпарцёр маленькай правінцыйнай газеты звярнуў увагу, што каля медаплавільных заводаў кусты бульбы здаровыя і працягваюць расці, тады як ва ўсіх іншых месцах яны даўно ператварыліся ў смярдзючую гнілату. Прайшло крыху часу — і ўсім ужо было зразумела: выратавальнік — медзь.

Сёння медзь у складзе бардоскай сумесі верай і праўдай служыць нашым садоўнікам і агароднікам. Да пашкоджання раслін любымі хваробамі апрацоўка гэтым саставам будзе выдатным прафілактычным сродкам. А пры заражэннях — лекамі.

Такую сумесь можна купіць у краме ў сухім выглядзе. У кожнай ўпакоўцы — медны купарвас, вапна і (павінна быць!) спецыяльна ўкладзеная індыкатарная палоска, каб праверыць правільнасць прыгатавання вадкай сумесі.

Калі гатовай сумесі няма, можна і самім яе прыгатаваць.

Неабходна толькі:

- набыць кампаненты
- захаваць прапорцыі
- строга прытрымлівацца паслядоўнасці прыгатавання

**Прапорцыі для бардоскай сумесі**

‣ 1-працэнтны раствор: на 10 літраў вады — 100 г меднага купарвасу + 150 г нягашанай вапны

‣ 3-працэнтны раствор: на 10 літраў вады — 300 г меднага купарвасу + 450 г нягашанай вапны

Нягледзячы на выдатныя ўласцівасці бардоскай вадкасці — лекара раслін, мы павінны памятаць: невялікая канцэнтрацыя медзі ў глебе — дабро, а лішак — шкода! Таму не будзем забываць словы Парацэльса: «Усё ёсць яд, і нішто не пазбаўлена атрутнасці. Адна толькі доза робіць яд незаўважным!» Лішак дачных хімікатаў абавязкова асядзе ў нашых арганізмах цяжкім грузам ужо чалавечых хвароб.

---

**22 ЛІПЕНЯ** Даты Падзеі Людзі

**1852** год — нарадзілася (в. Баландзічы, цяпер Іванаўскі раён) Марыя Магдалена Эліза Бутаўт-Андрэйковіч, беларуская мастачка. У 1860-я гады вучылася жывапісу ў Мюнхене, падарожнічала па Італіі. Член Літоўскага таварыства мастакоў у Вільні (1907). Працавала пераважна ў гістарычным жанры, пісала карціны і на рэлігійныя сюжэты. Сярод іх: «Хрыстос ацаляе сляпога», «Міласэрнасць каралевы Ядвігі» і іншыя. У 1870–1880-я гады ўдзельнічала ў выставах у Мюнхене, Кракаве, Варшаве. Займалася таксама асветніцкай дзейнасцю і філантропіяй, адна з першых збіральніц твораў народнага мастацтва. Памерла ў 1933 годзе.

**1894** год — а 8-й гадзіне раніцы ў Парыжы пачаліся першыя ў гісторыі аўтамабільныя гонкі. Ініцыятарам спаборніцтваў стаў галоўны рэдактар парыжскай газеты La Petite Journal П'ер Жыфар. Аўтамабільны прабег павінен быў прадэманстраваць магчымасці новага віду транспарту — самаходных экіпажаў. Удзельнікам трэба было прайсці на сваіх машынах зададзены маршрут — Парыж—Руан — за 12 гадзін. Машыны ўражвалі разнастайнасцю формаў і канструкцый. 39 аўтамабіляў мелі рухавікі ўнутранага згарання, за імі ішлі «паравікі» ў колькасці 28 штук. Было прадстаўлена па пяць электра- і пнеўмааўтамабіляў, 25 адзінак транспарту трапілі ў намінацыю «іншыя сістэмы». Пасля адборачных «заездаў» да старту дапусцілі 28 аўтамабіляў. Сыходзячы на дыстанцыю з паўхвілінным інтэрвалам, машыны пакідалі сталіцу і бралі курс на Руан, на 126 кіламетраў на паўночны захад. Да фінішу ўдалося дабрацца толькі 17 машынам. Найбольшую хуткасць (больш за 22 км/г) развіў 20-сільны парамабіль маркіза Альбера Дэ Дыёна. Аднак першы прыз па рашэнні журы быў падзелены паміж дзвюма бензінавымі машынамі марак Peugeot і Panhard. Іх палічылі самымі надзейнымі ў эксплуатацыі.



**1895** год — 120 гадоў таму нарадзіўся (г. Глыбокае) Павел Восіпавіч Сухой, вядомы савецкі авіяканструктар, доктар тэхнічных навук (1940), двойчы Герой Сацыялістычнай Працы (1957, 1965), лаўрэат Ленінскай (1968) і Дзяржаўнай прэмій СССР (1943, 1975). У 1925 годзе скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча. Адзін са стваральнікаў рэактыўнай і звышгукавой авіяцыі. Стварыў баявы шматмэтавы самалёт «Су-2», браніраваны штурмавік «Су-6». Сканструяваў больш як 50 мадэляў самалётаў, 20 з іх выпускаліся серыйна. На самалётах яго канструкцыі ўстаноўлены рэкорды свету па працягласці, хуткасці і вышыні палёту. Памёр у 1975 годзе. Яго імем названы Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт; у Гомелі, Глыбокім і Лунінцы пастаўлены помнікі.

**Было сказана**

**Сяргей ЗАКОННІКАЎ, паэт, перакладчык:**
*«На прызбу сесці побач з дзедам*
*Яшчэ патрэбна заслужыць».*

---

**Сябры і знаёмыя шчыра віншуюць з 60-годдзем**
старшыню Рэспубліканскага савета асацыяцыі работнікаў праваахоўных органаў «Шчыт Чарнобыля», ветэрана органаў унутраных спраў
**Алега Уладзіміравіча ПРЫЛУЦКАГА**!
Жадаюць яму моцнага здароўя, сапраўднага чалавечага шчасця, поспехаў у нялёгкай і высакароднай працы!

---

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 5.07 | 21.27 | 16.20 |
| Віцебск | 4.50 | 21.23 | 16.33 |
| Магілёў | 4.56 | 21.15 | 16.19 |
| Гомель | 4.55 | 21.10 | 16.15 |
| Гродна | 5.01 | 21.05 | 16.04 |
| Брэст | 5.32 | 21.33 | 16.01 |

**Месяц**

*Першая квадра 24 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

*Пр.* Аляксандра, Кірылы, Фёдара.
*К.* Марыі, Магдалены, Лаўрэнція.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Ого, у нас сёння рамантычная вячэра? Свечкі, масла...**
**— Халера, Пятровіч, зачыні капот!**

Прырода ўключыла тарыф «ЛЕТНІ ПАСКУДНЫ»: у будні — сонца, у выхадныя — дождж.

**— Дарма адмаўляешся, суп даволі такі прыстойны.**
**— Можа, суп і прыстойны, толькі прыстойныя людзі не ядуць яго ў тралейбусе.**

Электрык 5-га разраду палез у трансфарматарную будку і пасля 2-х разрадаў стаў электрыкам 7-га разраду.




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.569. Індэкс 63850. Зак. № 2864.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 21 ліпеня 2015 года.